# Глава VI. ОРГАНЫ КІРАВАННЯ ДЗЯРЖАЎНЫМІ МАЁМАСЦЯМІ. ГУБЕРНСКІЯ І ПАВЯТОВЫЯ ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАЛЬНЫЯ КАМІСІІ

## 6.1. Кіраванне дзяржаўнымі маёмасцямі

*(А. П. Жытко, С. А. Талмачова)*

28 снежня 1839 г. было зацверджана Палажэнне Дзяржаўнага савета «Об управлении имуществами в Западных губерниях и Белостокском крае». У адпаведнасці з ім ва ўсіх заходніх губернях адкрываліся **палаты дзяржаўных маёмасцей**. Выданне гэтага закона было звязана з рэалізацыяй рэформы П. Кісялёва. У распараджэнне палаты ўваходзілі кіраванне дзяржаўнымі сялянамі, аднадворцамі, замежнымі каланістамі, нагляд за незаселенымі казённымі землямі і землекарыстаннем. Акрамя таго, чыны палаты сачылі за выкарыстаннем казённых лясоў, удзельнічалі ў разглядзе судовых спраў, якія былі звязаны з дзяржаўнай уласнасцю. На чале палаты знаходзіўся старшыня, які прызначаўся непасрэдна імператарам. Палата складалася з гаспадарчага, ляснога і судовага аддзяленняў, якімі кіравалі дарадчык, губернскі ляснічы і спецыяльны асэсар. У 1845 г. дадаткова было ўтворана кантрольнае аддзяленне, а ў прысутнасць палаты быў уведзены яшчэ адзін асэсар. Гэтыя чыноўнікі прызначаліся міністрам дзяржаўных маёмасцей. У паўночна-заходніх губернях у палатах дзяржаўных маёмасцей быў і губернскі люстратар. У яго абавязкі ўваходзіла складванне зямельнага кадастру, вызначэнне павіннасцей дзяржаўных сялян і магчымага прыбытку казённых маёнткаў. З 31 сакавіка 1850 г. у палатах гэтых губерняў стваралася люстрацыйнае аддзяленне. На павятовым узроўні арганізоўваліся акругі дзяржаўных маёмасцей, якімі кіравалі акруговыя начальнікі. Яны прызначаліся кіраўніком палаты.

Палажэнне 19 лютага 1861 г. змяніла кампетэнцыю і структуру органаў Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. З гэтага часу дзяржаўныя сяляне былі перададзены з ведамства дзяржаўных маёмасцей ва ўстановы па сялянскіх справах, якія падпарадкоў-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ